И, наконец, в старших классах по числу школьников, называющих музыку любимым видом искусства, она выходит на первое место. Любителями музыки в этом возрасте является большая половина учащихся. Научить любить, понимать и осознавать музыку другой страны можно лишь с помощью самой музыки. Поэтому необходимо создавать условия для повышения музыкальной культуры учащихся.

Итак, можно сделать следующие выводы:

– песня представляет собой отражение существующей картины мира носителей языка, она показывает проблемы, тревоги, радости, страхи, ценности, мнения, размышления, по этой причине через изучение песен более основательно узнается чужая культура;

– через песни учащиеся приходят к осмыслению и осознанию того, что у любой культуры имеются свои характерные черты, своеобразные особенности, что представители разных культур могут замечать похожие вещи абсолютно по-разному, другими словами, у учащихся развивается межкультурная компетенция;

– для продуктивной работы с песней учителю нужно следовать принципам отбора песен: соответствия содержания возрасту учащихся, мелодичности, четкому голосу исполнителя, ритмичности, присутствию лингвострановедческого компонента;

– в условиях средних общеобразовательных учреждений песня считается подходящим дополнением к учебной программе, поскольку может выполнять многие функции, например, физиологическую, психогигиеническую, эмоциональную, когнитивную, коммуникативную, социально-психологическую, функцию бессознательного учения;

– песни создают у учащихся мотивацию к овладению иностранным языком, позитивный настрой, а также воспитывают учащихся духовно, формируют музыкальный слух, эстетически развивают их [4, с. 28].

В заключении, можно отметить, что правильное использование песни или музыки на уроках иностранного языка, на любом его этапе, помогает учащимся не только повысить качество изучаемого языка, но и расширить кругозор, развить творческий потенциал. Необходимо учитывать также то, что песни – незаменимое средство для образования приятного психологического климата и эмоциональной атмосферы на занятиях, для снятия напряжения и восстановления работоспособности учащихся.

## Литература

1 Леви, Л. Вопросы психобиологии музыки / Л. Леви // Советская музыка. – 1966. – № 8. – С. 37–43.

2 Веренинова, Ж. Б. Обучение английскому произношению с опорой на специфику фонетических баз изучаемого и родного языков / Ж. Б. Веренинова // Иностранные языки в школе. – 1994. – № 5, – С. 9–14.

3 Карпиченкова, Е. П. Роль музыки и песен в изучении английского языка / Е. П. Карпиченкова // Иностранные языки в школе. – 1990. – № 5. – С. 45–46.

4 Гебель, С. Ф. Использование песни на уроке иностранного языка / С. Ф. Гебель // Иностранныеязыки вшколе.– 2009. – № 5. – С. 28–30.

**УДК 821.161.3-1*В. Жыбуль:821.161.3-1*Зм. Вішнёў:141.32**

***А. В. Анцімонік***

# СПОСАБЫ РЭАЛІЗАЦЫІ ЭКЗІСТЭНЦЫЙНЫХ ПРАБЛЕМ У ТВОРЧАСЦІ В. ЖЫБУЛЯ І Зм. ВІШНЁВА

*У артыкуле раскрываюцца асноўныя адметнасці вырашэння экзістэнцыйных праблем у лірыцы В. Жыбуля і Зм. Вішнёва. Зроблены высновы аб асаблівасцях мастацкай рэалізацыі пытанняў жыцця і смерці, спасціжэння ўласнага «я», якія, найперш, заключаюцца ў бясстрашнасці лірычных герояў перад смерцю, у іранізаванні з жыцця і яго рэалій, у насычаных чорным гумарам роздумах аб межах экзістэнцыйнага існавання чалавека.*

Адно з адвечных пытанняў, якое хвалявала, хвалюе і будзе хваляваць чалавека – гэта пытанне яго існавання. Э. Фром у сваёй працы «Шляхі з хворага грамадства»прапанаваў думку: «Чалавек – адзіная жывая істота, якая адчувае ўласнае быццё як праблему, якую ён павінен вырашыць і ад якой ён не можа пазбавіцца» [1, с. 445]. Пад тэрмінам «экзістэнцыйныя праблемы»разумеюць сукупнасць тых праблем, што звязаны з чалавечым існаваннем (трагічнае светаўспрыманне (смерць, адзінота, страх, пакуты), абсурднасць свету і спроба яе пераадолець, міфалагізацыя асобы, спасціжэнне ўласнага «Я», непрыняцце грамадства, пошук сэнсу жыцця, пытанне свабоды, праблема выбару, каханне і расчараванне і інш.). Менавіта яны ў мінулым стагоддзі сталі аб’ектам увагі прадстаўнікоў экзістэнцыялізму (Ж. П. Сартра, А. Камю, М. Хайдэгера, К. Ясперса, С. дэ Бавуар) і выявіліся ў гэтым філасофска-эстэтычным напрамку ва ўсёй сваёй паўнаце і шматграннасці. Экзістэнцыйныя праблемы вылучаюцца сваёй універсальнасцю (прысутнічаюць у жыцці кожнага пастаянна і незалежна ад таго, асэнсоўваюцца яны людзьмі альбо не); з’яўляюцца ў выніку сутыкнення індывіда з быццём і перажываюцца ў суб’ектыўным унутраным свеце.

Трагічнае светаўспрыманне ў В. Жыбуля і Зм. Вішнёва праяўляецца даволі спецыфічна, што не дзіўна зыходзячы з іх «бумбамлітаўскага паходжання». Пытанні жыцця і смерці, кахання і адзіноты, шчасця і пакуты нярэдка ўспрымаюцца лірычнымі героямі з падлеткавым «пафігізмам»і ironіяй. Ю. Барысевіч так вызначае спецыфіку апошняй: «Вядома, яго [В. Жыбуля – А. А.] вершы багатыя на чорны гумар, але было б недаравальным спрашчэннем уважаць іх за рыфмаваныя анекдоты. Усмешка чытача патрэбная аўтару толькі дзеля таго, каб ажывіць наш твар – саскубсці з яго той наіўны, а часцей – скептычны выраз <…>» [2, с. 8]. Выразнае пацверджанне гэтаму тэзісу можна ўбачыць у вершы «Элегія», у якім бабулькі не давалі спакою мёртвай дзяўчынцы:

Дзяўчынка ў круглых тоўстых акулярах
і куртачцы смарагдавага колеру
без рухаў на зямлі ляжала,
а нейкія бабулькі
(здаецца, іх было чатыры)
дзяўчынку спрабавалі ставіць
дарозе перпендыкулярна [3, с. 27].

Паказальным з’яўляецца і верш «Зачыстка»В. Жыбуля, у якім акрамя іроніі ў дачыненні да смерці закранаецца пытанне безагаворачнай веры ў словы людзей, якіх грамадства прызнае аўтарытэтнымі, а значыць, асабістае меркаванне індывіда адыходзіць далёка на задні план:

Доктар сказаў:
– У морг! – Значыцца, у морг.
Ці ты добры чалавек,
ці старасвецкі горад,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ты маеш гонар,
але табе паведамілі:
– У морг! – Значыцца, у морг [3, с. 123].

У Зм. Вішнёва, у паэтыцы вершаў якога В. Акудовіч бачыць «факт экзістэнцыйнай арганічнасці» [4, с. 253], «смерць пужае гопнікаў і ракаў» [5, с. 25], у той час як у вершы «я вязу на пахаванне вянок…» лірычны герой абсалютна спакойна распавядае: «

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

навошта разбівацца
калі жыццё такое цудоўнае [10, с. 46].

У гэтым сэнсе яскравыя вершы паэта «Abiens, abi!», які прадстаўляе шэраг афарбаваных чорным гумарам гісторый пра самагубства людзей, звязаных з мастацтвам, «Канкан-балет» і «У бяздонне», дзе суіцыдальныя настроі мяжуюць з марай. У творы «вось боўтаюся на вяроўцы…» Зм. Вішнёва іронія ўзмацняецца поглядам на сябе-нябожчыка збоку: «боўтаюся жаўцею сінею буркацею // трупнымі плямамі пакрываюся // гнію разважаю пра смерць» [5, с. 18].

Па-рознаму творцы рэпрэзентуюць праблему кахання і шчасця. У В. Жыбуля лірычны герой часта адчувае адзіноту і немагчымасць быць разам з аб'ектам свайго захаплення. Так, верш «Я хачу паварушыць тваім хвастом…» завяршаецца страфой:

Мы сядзім і чакаем, што ж будзе далей,
не хаваючы закаханыя твары.
Я хачу да цябе дакрануцца, але
мы жывем у розных акварыумах [3, с. 26].

А ў творы «Туга»суб'ект наракае: «Я цябе клікаў. // Ты не прыйшла» [3, с. 42]. І нават калі закаханым удаецца быць побач – вакол «Апакаліптычная восень»: «Мы цалуемся ў ліфце, // які сарваўся ды падае» [3, с. 29]. Аднак, нягледзячы ні на што, герой верыць у каханне: «З табою // ўдваіх / нас болей, // чым IX» [9, с. 93].

У Зм. Вішнёва каханне не знаходзіць пазітыўнай афарбоўкі, а вершы з любоўнымі матывамі набываюць агрэсіўнае гучанне (вершы «Спартовая трампланаманія», «(садысцкія сны)», «калі здаецца ўсё скончана – распачынай з нуля…»і інш.). Зрэдку сустракаецца ў паэта ідэя жыватворнай сілы любові, як, напрыклад, у вершы «Я ажываю на поўначы».

Шчасце ж звычайна непрыцягальнае для паэтаў у традыцыйным разуменні гэтага феномена. Да прыкладу, у В. Жыбуля ў вершы «Мы самі ўем з сябе вяроўкі…»яно «тонамі гніе на складзе / у сейфах за калючым дротам» [3, с. 51], бо «мёртванароджанае»(верш «Тамагочы») [3, с. 189]. Лірычны герой Зм. Вішнёва ўсё ж пачуваецца няшчасным і таму амаль у духу фальклорных традыцый звяртаецца да астранамічнага аб'екта: «Сонца Сонца Сонца // крычу я ў зледзянелае неба // пазыч мне шчасця» [5, с. 57].

Экзістэнцыйныя пытанні, што тычацца спасціжэння ўласнай асобы, таксама займаюць важнае месца ў творчасці В. Жыбуля і Зм. Вішнёва. В. Акудовіч нават назваў зборнік апошняга «Тамбурны маскіт»наскрозь эгацэнтрычнай кнігай, якая «ва ўсялякім сваім фрагменце скіраваная на высоўванне персоны аўтара наперад усяго і ўсіх» [4, с. 254]. Час ад часу гэта прыводзіць да міфалагізацыі асобы, калі «Я»становіцца і богам, і героем, пра што заяўляецца адкрыта: «сумаваць не буду // таму што // герой» [5, с. 26] («чакатала…»); «Я помнікам узвышаюся на зэдліку ў // цэнтры цэнтральнага // адзінага пакоя»[5, с. 28] («Чытапаты»); «Значыць будзем героямі-муміямі // ўсе як адзін загінем у траншэях» [5, с. 73] («Афрыкоза пра камісараў»). Лірычны суб'ект В. Жыбуля, наадварот, нярэдка набывае негераічнае аблічча, выяўляючы нязначнасць асобнага чалавека ў параўнанні з Сусветам і грамадствам (вершы «Кропля вады», «Як захачу – у іншы бок…», «Зачыстка» і інш.).

Цікава, што страх і свабода як экзістэнцыйныя праблемы не знаходзяць яскравага выражэння ні ў аднаго паэта, ні ў другога. Магчыма, на страх творцы разлічваюць як на рэакцыю чытачоў, таму вершы рэпрэзентуюць не саму праблему, а мусяць напалохаць, як напрыклад, В. Жыбуль у вершы «Дрыжыкі»:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ой, ды на курганках параскінуліся крыжы, крыжы, крыжы
(зблізу – крыжы, а здалёк – крыжыкі, крыжыкі).
Ідзі, ідзі паўз іх і дрыжы, дрыжы, дрыжы, дрыжы:
няхай, няхай цябе прабіраюць дрыжыкі,
дрыжыкі, дрыжыкі, дрыжыкі… [3, с. 18].

Папераджальны характар носяць і творы Зм. Вішнёва «ў партфелі – не паперы…», «хрыплю…», «Кажаны – гэта не жах…»і інш.

Праблема свабоды перажываецца лірычным героем В. Жыбуля праз адарванасць ад рэчаіснасці, пэўную немагчымасць існавання «тут і зараз»з-за «выпадзення»з жыцця (вершы «Свабода», «Пуп неба»і інш.). Зм. Вішнёў зрэдку выкарыстоўвае дадзены панятак у асэнсаванні яго неабходнасці іншым людзям (вершы «не вясна і не краіна…», «У падарунак – гарбуз»).

Такім чынам, кола экзістэнцыйных праблем у творчасці В. Жыбуля і Зм. Вішнёва знайшло сваё адметнае адлюстраванне. Асаблівасці мастацкай рэалізацыі пытанняў жыцця і смерці, спасціжэння ўласнага «я»найперш заключаюцца ў бясстрашнасці лірычных герояў перад смерцю, у іранізаванні над жыццём і яго рэаліямі, у насычаных чорным гумарам роздумах аб межах экзістэнцыйнага існавання чалавека. І ўсё гэта без прэтэнзій на адзінае вытлумачанне і ісціну.

**Літаратура**


1 Фромм, Э. Пути из больного общества / Э. Фромм // Проблема человека в западной философии: сборник переводов с английского, немецкого, французского / под ред. Ю. Н. Попова. – Москва: Прогресс, 1988. – С. 443–482.

2 Барысевіч, Ю. Эксгуматар паэтычнага слова / Ю. Барысевіч // Жыбуль, В. Стапеліі: вершы / Віктар Жыбуль. – Мінск: Галіяфы, 2012. – С. 3–8.

3 Жыбуль, В. Стапеліі: вершы / Віктар Жыбуль. – Мінск: Галіяфы, 2012. – 220 с.

4 Акудовіч, В. Верашчака з яйкаў клёкатамуса / В. Акудовіч // Вішнёў, Зм. Тамбурны маскіт / Зміцер Вішнёў. – СПб: Невский простор, 2001. – С. 252–254.

5 Вішнёў, Зм. Тамбурны маскіт / Зміцер Вішнёў. – СПб: Невский простор, 2001. – 256 с.

6 Камю, А. Миф о Сизифе / А. Камю // А. Камю. Бунтующий человек. Философия. Политика. Искусство. – М.: Полиздат, 1990. – С. 23–100.

7 Вішнёў, Зм. Фараон у заапарку: тэксты / Зміцер Вішнёў. – Мінск: Логвінаў, 2007. – 170 с.

8 Вішнёў, Зм. Шоргат жукоў: тэксты / Зміцер Вішнёў. – Мінск: Галіяфы, 2011. – 92 с.

9 Жыбуль, В. Дыяфрагма: паэзія / Віктар Жыбуль. – Мінск: Логвінаў, 2003. – 112 с.

10 Жыбуль, В. Вуха бліжняга: вершы // Дзеяслоў. – 2014. – №4 (71). – С. 45 56.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**УДК 347.518**

***Е. В. Артюх***

## ОСОБЕННОСТИ ВОЗМЕЩЕНИЯ ВРЕДА, ПРИЧИНЕННОГО ТРАНСПОРТНЫМ СРЕДСТВОМ

*Статья посвящена рассмотрению особенностей возмещения вреда, причиненного транспортным средством. В данной статье рассмотрен порядок возмещения*